Алесь Кудрыцкі

# Казік з Каменнай Горкі

## і Вядзьмак Схаванага Горада

ЯНУШКЕВІЧ
выдавецтва


Схаваны
Горад
Нямiга
Мост Трох Чарапахаў
ВАКЗАЛ
Вуліца
Драбностквая
Пан
КАРТАПЛЯН


Ліцэй
Дубарога
Моцнага
Дзедадуб
Ратуша
Балотны
рынак
Баброўка
Іржавы
горад
Блукашлях
Мапу маляваў
Казік Бондар

Алесь Кудрыцкі
КАЗІК З КАМЕННАЙ ГОРКІ
І ВЯДЗЬМАК СХАВАНАГА ГОРАДА

Дызайн вокладкі — Вольга Зароўская

ISBN 978-83-967190-1-0

© Кудрыцкі А. У., 2023
© Зароўская В. У., вокладка, 2023
© Афармленне. Andrei Yanushkevich Publishing, 2023

## Раздзел першы

# ТАЯМНІЧАЯ ПАЧВАРА

У апошні дзень лета на стадыёне гімназіі нумар 777 сабралася шумная кампанія дзяцей. Нехта ганяў у футбол, уздымаючы воблакі пылу. Хтосьці залез на жалезную стойку з баскетбольным кальцом і дурэў, разгойдваючы яе з боку ў бок. Хтосьці гуляў у даганялкі ці проста балбатаў пра канікулы, што так хутка праляцелі. Усе былі радыя пабачыцца з сябрамі — і ніхто не звярнуў увагі на незнаёмага хлопчыка.

Ён асцярожна рушыў праз натоўп з вялікай кардоннай скрыняй у руках. Нікім не заўважаны, хлопец выбраў зацішны куток і паставіў свой груз на траву. Потым ён выцягнуў з кішэні тоўсты чырвоны фламастар і, прыкусіўшы кончык языка, накрэмзаў на скрынцы вялізнымі літарамі:

«Не адкрываць! Смяротна небяспечна!»

Адступіўшыся на пару крокаў, ён прыдзірліва агледзеў надпіс, задуменна пачухаў патыліцу і дамаляваў побач злавесныя чэрап і косткі.

Скончыўшы працу, хлопчык агледзеўся.

Многія дзеці гулялі на стадыёне са сваімі хатнімі гадаванцамі. Тут былі не толькі сабакі і каты, але і марскія свінкі, і хамячкі. Нехта нават прынёс хамелеона, і дзеці спрабавалі прымусіць яго змяніць колер, выпусціўшы ў траву. Хамелеон насцярожана варочаў зрэнкамі ва ўсе бакі і паслухмяна зелянеў. Потым ён пажаўцеў, бо перайшоў на пясчаную сцежку, а пасля ўвогуле зрабіўся паласаты, пачаўшы караскацца на турнік, пафарбаваны ў белыя і чырвоныя палосы.

Калі новы хлопчык убачыў гэту экзатычную жывёлінку, у яго вачах праблiснула лёгкая зайздрасць. Столькі цікавага навокал... Не дзіва, што нікому няма клопату да ягонай скрынкі. Ды і сам ён нічым асаблівым не вылучаўся сярод іншых дзяцей на стадыёне. Мешкаватая байка з капюшонам, яўна купленая навырост, звісала з яго худых плячэй. На нагах — стаптаныя красоўкі. Калі і было ў хлопчыку штосьці адметнае, дык гэта вочы. Падобныя да дзвюх кропелек бурштыну, яны ззялі хітраватымі іскрынкамі.

І тут нарэшце ў яго з'явіўся першы глядач — дакладней, глядачка:

— Ого, а гэта што яшчэ такое?

Перад скрынкай спынілася бялявая дзяўчынка ў вялікіх акулярах. Яна зняла іх, працерла, а потым зноў надзела, вывучаючы пагрозлівы надпіс.

— Так-так-так... Смяротна небяспечна. Хм. Цікавенька-цікавенька.

Дзяўчынка выцягнула з сумачкі тэлефон і сфоткала злавесны малюнак чэрапа ды костак. Гэта адразу заўважылі яе сяброўкі. Праз хвіліну вакол скрынкі сабраўся невялікі натоўп разявак. Гімназісты ды гімназі-

сткі перашэптваліся, паказваючы пальцамі на таямнічую кардонную скрыню.

— А можаш адчыніць? — спыталася дзяўчынка ў акулярах.

— Нельга, — паматаў галавой хлопчык. — Хіба чытаць не ўмееш? Смяротна небяспечна.

— Хто там сядзіць?

— Небяспечная істота.

Дзяўчынка недаверліва прыжмурыла вока:

— Ведаеш што? Мне здаецца, ты проста выдумляеш.

— Не хвалюйся, — хмыкнуў незнаёмец. — Паверыш як міленькая, калі ён адхопіць табе руку па локаць.

Натоўп спужана вохнуў ды падаўся назад. Толькі ўпартая дзяўчынка-акулярніца засталася на сваім месцы. Яна прысела на кукішкі і зазірнула ў скрынку праз вузенькую шчыліну.

— Хм... І праўда — там нехта ёсць. Якаясьці калматая страшыдла.

Дзяўчынка грукнула пальцам па скрыні. Нешта цяжка варухнулася ўнутры.

— Апчхі! — грымнула адтуль, нібы гарматны стрэл.

Дзяўчынка імгненна прыбрала руку, быццам дакранулася да гарачай патэльні.

— І як гэты звер называецца? — перапытала яна дрыготкім голасам.

— Не ведаю, — паціснуў плячыма хлопчык.

— Што значыцца — не ведаеш?

— А вось так. Не ведаю, і ўсё.

— Ну добра. А чым ты яго корміш?

— Павукамі, напрыклад...

— Бее!

— Яшчэ слімакоў ён любіць...

— Фе!

— А аднойчы ён сцапаў жабку і злопаў яе разам з лапкамі.

— Усё, досыць, замаўчы, не расказвай! — закрычалі дзяўчаты, заціснуўшы вушы далонямі. Затое хлопцы ажно падскоквалі ад захаплення:

— Клас! А пацукоў ён любіць? А хамелеонаў?

Маленькі хлопчык-першакласнік, уладальнік хамелеона, на ўсякі выпадак хуценька схаваў свайго гадаванца ў сумку.

— Стоп! Я зараз аглухну. Сціхніце ўсе! — скамандавала дзяўчынка ў акулярах. — Гэй ты… Як цябе, дарэчы, завуць?

— Казік.

— Ану, Казік, давай выкладвай усё як было. З самага пачатку. Адкуль у цябе гэтая, кхм… істота?

— Магу расказаць, калі цікава.

Дзеці зноў пачалі ціснуцца бліжэй, каб лепей пачуць.

— Ну, слухайце, — пачаў свой аповед хлопчык. — Значыцца, справа была так. Улетку я быў у Вялікай Ластаўцы.

— Дзе-дзе?

— Ну, у вёсцы маёй. Там мая мама нарадзілася. Мы туды ездзім на канікулы. Дык вось, за старой сажалкай у нас стаіць панская сядзіба. Разбураная такая.

— З прывідамі? — спужана віскнуў хлопчык з хамелеонам.

— Ды не, якія прывіды. Хаця… хто яго ведае? Карацей, я не пра тое. От, збіў ты мяне. Пра што гэта я казаў?

Хлопчык нахмурыў лоб, спрабуючы згадаць.

— Панская сядзіба, — нагадала дзяўчынка ў акулярах.

— А, правільна. Дык вось, аднаго разу я вырашыў яе даследаваць. Залажу, значыцца, у тую разваліну. Ну а там пылішча, павуцінне паўсюль звісае. І раптам...

— Прывід! — з жахам уздыхнуў маленькі хлопчык і заплюшчыў вочы.

Усе пакаціліся з рогату.

— Не, не прывід, — з лёгкім шкадаваннем сказаў новы хлопец. — Але затое я знайшоў нешта іншае. Значыцца, пасярэдзіне панскага дома — вялікая зала. А ў ёй — стары камін. І тут я бачу — эге! Нешта ў ім ляжыць. Дай, думаю, праверу. Засунуў руку ў старое вуголле — а там яйка. Вялізнае, як мяч. І зусім чорнае.

Слухачы прыціхлі, ловячы кожнае слова.

— Я ўзяў яго і аднёс да сябра. У яго бабуля курэй трымае. Паклалі мы яйка пад курыцу. Пачакалі пару тыдняў.

— І што?

Хлопец з гонарам паляпаў па скрынцы.

— А вось што. Вылупіўся. Хто — не ведаю. Але такі куслівы — проста жах. Усе рукі мне падрапаў. Давялося схаваць пад замок. Я назваў яго Рэксік. Ну, тыпу як тыраназаўр рэкс — толькі маленькі.

Натоўп у маўклівым здзіўленні паглядаў на скрыню з загадкавай істотай.

— Ну ўсё, нам канец, — піскнуў у цішыні першакласнік. — Я ведаю, хто гэта.

Усе сцішана змоўклі.

— Гэта цмок. Сто працэнтаў.

Натоўп выбухнуў рогатам.

— Які яшчэ цмок? — фыркнула дзяўчынка ў акулярах. — Ніякіх цмокаў не бывае.

— А вось і бывае, — упарціўся першаклашка з хамелеонам. — Я ў фільме бачыў!

— Ды хіба гэта цмок? Крылаў у яго няма, агнём з пашчы не дыхае.

— Значыць, гэта дыназаўр! — крыкнуў руды хлопец ззаду натоўпу. — Я ў энцыклапедыі чытаў — дыназаўры таксама з яек вылупліваліся.

— Сам ты дыназаўр! — перадражніла яго дзяўчынка ў акулярах. — Па-першае, яны даўно вымерлі. А яшчэ, вось, глядзі ў шчылінку — ён пакрыты белай шэрсцю. Дзе ты калі бачыў белых пухнатых дыназаўраў?

— Значыцца, гэта тутэйшы, беларускі дыназаўр, — не разгубіўся руды хлопец. — Хутка зіма — вось ён шэрсць і адгадаваў. Белую — каб не быць заўважным на снезе.

Дзяўчынка не здавалася:

— Дыназаўры не бываюць такія маленькія!

— Значыцца, яшчэ не вырас.

— Ат, глупства кажаш, — адмахнулася ад яго дзяўчынка і задуменна нахмурыла лоб. — І ўсё ж такі, хто б гэта мог быць?

Дзеці нібы зачараваныя ўтаропіліся ў скрыню.

— Магчыма, гэта чупакабра, — сказаў Казік. — Кажуць, ёсць такая істота. Вельмі небяспечная. Яе часам сустракаюць, нават у Беларусі, але ніхто дагэтуль яе не злавіў. А ў мяне вось атрымалася.

— Слухай, а занясі свайго Рэксіка-чупакабрыка ў Акадэмію навук, — прапанаваў адзін з гледачоў. — Хай навукоўцы разбяруцца. Можа, гэта і праўда дыназаўр ці цмок. Раптам яны пачнуць іх гадаваць? Во будзе крута!

Але гаспадар кардоннай скрыні толькі пагардліва хмыкнуў:

— Знайшоў дурня! Ведаю я гэтых дарослых. Яны адразу ж адбяруць Рэксіка, каб рабіць розныя эксперыменты. Не ўжо, дзякуй. Хай лепей жыве ў мяне.

Яго перапыніў насмешлівы голас збоку:

— Што гэта ў вас там?

Усе погляды скіраваліся на гімназіста, які стаяў крыху зводдаль, паасобку, і назіраў за сцэнай спадылба. Вастраваты нос, прылізаныя чарнявыя валасы і ўчэпісты позірк рабілі яго падобным да драпежнай птушкі.

— Так-так...

Не сказаць каб гэты хлопец быў асабліва дужы ці надта высокі. Але было штосьці такое ці то ў яго цягучым поглядзе, ці то ў злавеснай ухмылцы, ад чаго ўсе нібы праглынулі языкі. А можа, рэч была ў байцовым сабаку, якога хлопец трымаў на ланцугу. Той, вылупіўшы чырвоныя вочы, хрыпеў, нібы паравоз, і цягнуўся носам да скрыні.

— Гэта хто яшчэ такі?

Гаспадар сабакі грэбліва кіўнуў у бок новага хлопчыка.

— Новенькі, — сказала дзяўчынка. — Яго завуць Казік.

— І ён вельмі круты, — захоплена дадаў першаклашка з хамелеонам.

Белы сабака ашчэрыў жоўтыя зубы ды пагрозліва забурчаў.

— Круты? Гэта яшчэ чаму? — нахмурыў бровы Дзюба, а ўсмешка на ягоным твары зрабілася зусім пляскатая.

— Таму што ў яго скрынцы самая афігенская жывёліна ў свеце! Самы сапраўдны дыназаўраўскі цмокавы чупакабр!

Казік крыху няёмка кашлянуў:

— Ну добра, мне ўжо дахаты трэба — Рэксіка карміць. Бо ён хутка зробіцца галодны ды злосны.

— Чакай-чакай.

Дзюба змераў Казіка вокам і смачна сплюнуў.

— Чупакабра, кажаш?

Ён пхнуў нагой кардонную скрынку так, што тая ледзь не перакулілася.

— Гэй ты, асцярожней, — нахмурыў бровы Казік.

— Вой-вой-вой, якія мы далікатныя, — здзекліва прапішчаў Дзюба. — Уці-пуці. Сюслі-мюслі. Толькі не кранайце майго хамячка!

— Вось і не чапай, пашкадуй сваё здароўе.

Маленькі першакласнік спужана войкнуў:

— Калі ласачка, асцярожна! З цмокамі жарты дрэнныя.

Дзюба шмыгнуў носам:

— Хай спачатку пакажа нам свайго — хе-хе — цмока.

Ён з выклікам зірнуў на Казіка.

— Ану даставай сваю марскую свінку, ці хто ў цябе там. Дакажы, што ты не брахло.

Усе позіркі ўтаропіліся ў Казіка. Гледачы жадалі пабачыць незвычайную жывёлу на свае ўласныя вочы. Хлопчык прыкусіў губу, вагаючыся.

— Ну, добра. Але калі нешта пойдзе не так, то я не вінаваты. Самі напрасіліся.

Ён прысеў і пачаў павольна адкрываць скрыню.

— Значыцца, так. Я дастану Рэксіка на хвілінку, а потым зноў схаваю. Рукамі яго не кранаць. Не хапала яшчэ, каб ён кагосьці з вас пакусаў.

Казік засунуў руку ў скрынку і асцярожна выцягнуў на свет невялікую, але дужа нягеглую істоту. Яна нагадвала напалову здзьмуты футбольны мяч, пакрыты

бруднавата-белай шэрсцю. Уздоўж яе хрыбта раслі шыпы, якія глядзелі ў розныя бакі. Доўгія заднія лапы боўталіся ў паветры. Вялікая галава, падобная да голага чэрапа, цяжка гайдалася з боку ў бок. Чырвоныя вочкі звера мітусліва зіркалі туды-сюды ў глыбокіх вачніцах, нібы дзве жарынкі з вогнішча.

— Гр-р-р-гаў!

Дзюбаў сабака наставіў вушы, адно з якіх было парванае ў бойцы, ашчэрыўся, пырснуў слінай і раптоўна кінуўся наперад. Пачвара завішчала дурным голасам. Яе гаспадар таксама:

— Прыбяры сваю дурную псіну!

Казік крычаў, ледзь утрымліваючы за ашыйнік свайго таямнічага гадаванца, які ашалеў з перапуду і рваўся наўцёкі.

— Клац!

Вострыя іклы сабакі шчоўкнулі за нейкі сантыметр ад галавы Рэксіка. Той віскнуў, вырваўся з рук Казіка ды пляснуўся вобзем.

— А-а-а! — вохнуў натоўп. — Ён разбіўся!

Ад удару чэрап Рэксіка раскалоўся і разваліўся на кавалкі, нібы шкарлупінка яйка. Але вось дзіва — з-пад яго паказалася зграбная галоўка са шчыльна прыціснутымі доўгімі вушкамі. Тут ужо спужаўся нават сабака Дзюбы. Бультэр’ер адпоўз на пузе назад і залівіста брахаў.

Натоўп стаяў знямелы. Ніхто не мог зварухнуцца ад жаху. І толькі Дзюба рагатаў, сагнуўшыся напалам:

— Ха-ха-ха, трымайце мяне… Цмок! Чупакабра! Ну, што я вам казаў? Ды разуйце ж вы свае вочы. Гэта трус, звычайны хатні трусік! Чыстая дурылка!

Таямніца рассыпалася на вачах. Казік спешна спрабаваў запхнуць свайго гадаванца назад у скрыню, але

ў спешцы паабломваў апошнія шыпы, прымацаваныя да ягонай спіны. Цяпер бачылі ўсе — у руках хлопчыка быў звычайны белы хатні трус, старанна замаскіраваны пад невядомага монстра.

— Дык ты ўсё гэта выдумаў?

Не паспеў Казік схаваць трусіка назад у скрынку, як расчараваныя гледачы пачалі разыходзіцца. Бялявая дзяўчынка стрэльнула абураным позіркам з-пад акуляраў.

— Захацеў праславіцца? — з'едліва буркнула яна. — Мог бы прыдумаць штосьці лепшае. Перадавай прывітанне свайму трусіказаўру.

Натоўп вокамгненна растаў. Дзюба сыходзіў з пераможна задраным падбароддзем. А наперадзе, выскаліўшы жоўтыя іклы, ганарліва ступаў ягоны сабака.

Казік апусціўся на траву побач са скрынкай і маркотна звесіў галаву. Эх... А ўсё так добра пачыналася. Калі б ён меў сапраўднага сабаку, гэта была б зусім іншая рэч. Хто ж вінаваты, што яго гадаванцам быў гэты недарэка, стары трус Рэксік?

Заўтра першага верасня, а ягоны план з трэскам праваліўся. Казік думаў, што пойдзе ў новую школу героем. Уладальнік таямнічага монстра! Так хацелася, каб новыя сябры ім захапляліся... А цяпер з яго ўсе будуць толькі смяяцца. І, відаць, сябры ў яго з'явяцца яшчэ вельмі не хутка.

Хлопец горка ўздыхнуў і са злосці пхнуў нагой скрынку. Тая надзіва лёгка перакулілася, нібыта ў ёй нікога не было. Што за фокусы?

Казік падняў накрыўку.

Скрыня была пустая!

## Раздзел другі

# АСЦЯРОЖНА, ДЗВЕРЫ ЗАЧЫНЯЮЦЦА!

Казік стаў на калені і абмацаў скрыню знутры. Нікога. Мабыць, ён забыўся закрыць яе.

Рэксік збег!

Казік круціў галавой ва ўсе бакі. Куды падзеўся бязглузды трусік?

Ага, вось ён!

На самым ускрайку школьнага стадыёна мільганула шэрая плямка.

— Стой!

Але куды там. Трус ляцеў наперад так, што ажно пяткі блішчалі. Казік быў гатовы драць на сабе валасы:

— Ты куды, даўбешка бязмозглая?

Хлопчык кінуўся за даўгавухім бегляком. Але паспрабуй ты прапхніся праз такі натоўп! Казік бег спатыкаючыся, увесь час збіваў некага з ног і ледзь не расціснуў у блін няшчаснага хамелеона, якога хлопчык-першакласнік нарэшце наважыўся выпусціць пагуляць.

Праляцеўшы стадыён, Казік выскачыў за школьную браму. Адтуль праз невялікі парк ён выбег на шыра-

чэзны праспект. Цяжка дыхаючы, хлопчык азірнуўся па баках. Але Рэксіка не было і знаку. Трус знік.

Казік злосна рассек паветра кулаком. І што цяпер рабіць?

Яго план зрабіцца знакамітым праваліўся. Рэксік збег. Уся школа будзе з яго смяяцца. І ўсё праз гэты пракляты пераход у новую школу! Чым была дрэнная яго старая школа ў Каменнай Горцы? Ну так, там было па трыццаць чалавек у класе. Але ж там хаця б былі сябры. А маме заманулася перавесці яго ў знакамітую гімназію нумар 777 у самым цэнтры горада. Казік згадаў, як яна ўпершыню сказала яму пра гэтую ідэю.

— Я і не ведаў, што ў Мінску столькі гэтых гімназій, — прабурчаў тады Казік. — Слухай, а нашто мне ўвогуле хадзіць у школу?

— Каб ты вырас і стаў чалавекам, — казала яна.

— А я і так чалавек, — ганарліва адказаў Казік і ўпусціў бутэрброд сабе на штаны.

— Ну-ну, гэта мы яшчэ паглядзім, — пакачала галавой мама.

Трапіць у новую гімназію было не так проста. Але калі Казікавай маме нешта прыходзіла ў галаву, то яна свайго дабівалася. Яна хадзіла па нейкіх міністэрствах, збірала паперы і нарэшце патэлефанавала сваёй старой сяброўцы, у якой была цётка, што ведала нейкага вялікага начальніка. Так справа была вырашана. З гэтага года Казік павінен быў зрабіцца вучнем прэстыжнай гімназіі ў самым цэнтры горада.

Канікулы хутка прабеглі. Набліжалася першага верасня. І тут на Казіка напаў страх. Гэта ж вам не хухры-мухры — новая школа! Там усе будуць такія крутыя, прасунутыя... Казік не ведаў у новай гімназіі ніводнай

жывой душы. Ці не засмяюць яго, звычайнага хлопчыка з Каменнай Горкі — раёна на ўскрайку горада?

І тады Казіку прыйшла ў галаву адчайная ідэя. Што, калі ён крыху ўдасканаліць свайго труса? Ну, скажам так — зробіць Рэксіку невялічкі апгрэйд? А потым прагуляецца з ім на школьным стадыёне ў апошні дзень канікулаў, калі там збяруцца яго будучыя аднакласнікі...

Казік адшукаў сваю старую цацку-дыназаўра і разламаў яе на часткі. Узяў паперы, тканіны ды клейкай стужкі. Наклеіў шыпы, падфарбаваў шэрсць, а на галаву Рэксіку нахлабучыў пусты пластмасавы чэрап цацачнага дыназаўра. Паўгадзіны працы, і — о цуд — яго старэнькі трусік-пенсіянер ператварыўся ў маладога перспектыўнага монстра.

Вось толькі Рэксіку новая роля яўна не спадабалася. Ён адчуваў няладнае, усяляк вылузваўся з рук, не хацеў цягаць на сабе ўсю гэтую бутафорыю. Затое хлопчык быў у захапленні. Клас! Цяпер не давядзецца чырванець ад сораму перад новымі сябрамі. Што-што, а такога гадаванца ўжо дакладна не будзе ні ў кога.

Яшчэ трошкі — і Казік будзе героем усёй школы!

Так і атрымалася. Вось толькі геройства было зусім не такое, якога ён чакаў.

І вось цяпер навокал шумеў гарадскі натоўп. Па праспекце з гулам праносіліся аўтамабілі ды аўтобусы. Рэксіка нідзе не было відаць. Дзе яго шукаць у такім тлуме?

— Прабачце, калі ласка, ці не прабягаў тут белы трус?

Казік чапляўся да мінакоў з роспытамі, але тыя толькі паціскалі плячыма і спяшаліся далей. Хлопчык нават падышоў да пагрозлівага міліцыянта на скрыжа-

ванні, але ў апошнюю секунду перадумаў. Яшчэ, чаго добрага, арыштуе яго за недагляд хатняй жывёлы!

Стомлены і ўзмакрэлы, Казік валачыўся па праспекце. У галаве блыталіся невясёлыя думкі. Заўтра першы дзень у новай школе. Як сустрэнуць яго аднакласнікі? І галоўнае — што цяпер скажа мама?

Казік падняўся на мост над вуліцай Нямігай і спыніўся, пазіраючы ўніз, на бясконцую плынь аўтамабіляў і людзей. Зрэшты, што і дзівіцца. Калі б ён сам быў на месцы свайго трусіка, то збег бы ўжо даўным-даўно.

Рэксік з'явіўся ў Казіка, калі той толькі пайшоў у першы клас у сваёй старой школе. Ён частаваў вясёлага белага трусіка моркаўкамі і лічыў сваім найлепшым сябрам.

Шмат часу сплыло з тае пары. Казік вырас на некалькі галоў. Старыя джынсы, якія ён насіў у першым класе, зрабіліся яму кароценькія. А Рэксік за гэты час пастарэў. Здавалася, з яго хлопчык таксама вырас. Сумны, нецікавы... Гуляцца з ім Казіку ўжо даўно не хацелася. Але ж не здасі яго ў сэканд-хэнд! Вось Рэксік і дажываў свой век у клетцы, не патрэбны свайму гаспадару.

А што, калі трусік больш увогуле ніколі не знойдзецца? Жахліва, вядома. Але тады, магчыма, мама дазволіць яму завесці сабаку?

Казіку соладка зашчаміла сэрца ад гэтай думкі, але ён рашуча пакруціў галавой, абтрасаючы здрадніцкія мроі. Няма чаго і думаць пра такое. Ён выдатна ведаў, што скажа маці. Які сабака, ты што, здурнеў? Іх кватэрка была занадта маленькая, а жыццё ў Мінску — занадта дарагое. Ды і нельга так проста кінуць старога сябра, каб завесці новага, скажа яна.

На ашыйніку Рэксіка была бірка з іх хатнім адрасам. Раней Казіку ніколі б у галаву не прыйшло, што яна можа быць карысная. Але цяпер ён шчыра ўзрадаваўся, што некалі вырашыў пазначыць на ёй свой нумар тэлефона. Цяпер можна было спадзявацца, што нехта зловіць трусіка і пазвоніць, каб аддаць.

А што, калі не?

Казік уздыхнуў. Як ні круці, а Рэксіка трэба было адшукаць.

Раптам пранізліва завішчалі аўтамабільныя тармазы. Паветра разрэзаў рэзкі гудок. Бялявы камячок зігзагам сігануў праз дарогу.

— Вось ты дзе!

Казік стрымгалоў збег з моста і скаціўся, спатыкаючыся, да дарогі, свідруючы натоўп. Адкуль у старога Рэксіка было столькі спрыту? Налева, направа, зноў налева, а потым уніз, уніз, уніз…

Трус шаснуў у падземны пераход.

Метро!

Казік рэзка затармазіў перад турнікетам. Жэтончык, жэтончык… Ён шукаў у кішэнях, не зводзячы вачэй з трусіка. Рэксік белай плямкай мільгаў сярод лесу чалавечых ног. Яшчэ секунда — і ён зноў знікне.

З грукатам падышоў поезд. Дзверы адчыніліся і выпусцілі на перон чарговую порцыю пасажыраў.

Нарэшце Казік знайшоў жэтон і забег на платформу.

— Станцыя «Няміга», — абвясціў нябачны прыемны голас. — Увага! Па тэхнічных прычынах поезд далей не ідзе. Калі ласка, пакіньце вагоны.

Рэксік заскочыў у пусты поезд. Хлопчык кінуўся за ім супраць людской плыні. Цудоўненька! Дурненькі трус. У вагоне нікога няма. Значыцца, тут яго будзе лёг-

ка сцапаць. Вось толькі дзе ён падзеўся? Казік нахіліўся да самай падлогі, зазіраючы ў цёмныя куткі.

— Ляпс! Пш-ш-ш...

Дзверы з ляскам зачыніліся. Поезд тарганууўся і рушыў наперад. Мармуровыя калоны станцыі павольна паплылі за шклом. Людзі на пероне здзіўлена пазіралі ўслед хлопчыку, які ехаў зусім адзін у пустым вагоне.

Казік упёрся ў зачыненыя дзверы, грукаючы далонямі па шкле. Але яго ніхто не пачуў. Цягнік набраў хуткасць і нырнуў у цёмны тунэль.

## Раздзел трэці

# ТУНЭЛЬ У НЕВЯДОМАСЦЬ

Казік стаяў разявіўшы рот, а поезд каціўся ўсё глыбей і глыбей у чорную бездань. У вагоне было пуста. І ні следу Рэксіка. Вось дык прыгода!

Раптам святло ў вагоне мігнула ды згасла. Толькі іскры бліскалі з-пад колаў поезда, асвятляючы раз-пораз навакольную цемру.

Хлопчык намацаў сядзенне і ў разгубленасці сеў.

Куды цяпер?

Хутчэй за ўсё, цягнік ехаў на стаянку ў дэпо. Вось будзе гісторыя, калі давядзецца прасядзець там да раніцы! Нічога не скажаш — файны спосаб прагуляць свой першы дзень у новай школе.

Казік заўважыў на сцяне чырвоную загагуліну — рычаг аварыйнага тормаза. Рука сама пацягнулася да яго, але хлопчык у апошні момант передумаў. Што, калі яму дадуць штраф за наўмыснае тармажэнне? Грошай, каб расплаціцца, у Казіка не было. Значыцца, будуць званіць дахаты. Вось будзе сюрпрыз будзе для мамы...

Цягнік спачатку ехаў павольна, як быццам адпачываў пасля доўгай вандроўкі. Але потым пачаў набіраць хуткасць. Пустыя вагоны падскоквалі штораз весялей. Праз хвіліну Казік мусіў схапіцца за сталёвыя парэнчы, каб не зляцець на падлогу. Цягнік ужо не ехаў, а імчаў наперад, нібы на амерыканскіх горках у парку атракцыёнаў, узлятаў угару ды правальваўся ў яміны. У жываце Казіка нешта заказытала. Аладкі, якія ён з'еў на сняданак, рваліся на волю.

Здавалася, вось-вось — і поезд зляціць з рэек ды трапіць у катастрофу. Хіба машыніст страціў прытомнасць? Або заснуў?

Трэба было нешта рабіць.

Чарговы сполах іскраў на момант асвятліў дзверы ў канцы вагона. Кабіна машыніста!

— Ага, вось туды мне і трэба.

Казік пачаў асцярожна прасоўвацца наперад, хапаючыся за парэнчы ды сядзенні, боўтаючыся ды куляючыся з боку ў бок. Вагон шалёна скакаў і хістаўся. Хлопчыку здавалася, што ён трапіў у вялізную пральную машыну, якая са страшэнным скрыгатам ды грукатам круціла яго ва ўсе бакі. Толькі замест таго, каб рабіцца чыстым, ён усё больш забруджваўся, бо штуршкі поезда ўвесь час збівалі з ног на пыльную падлогу.

Нарэшце ён дапоўз да дзвярэй ды з усяе моцы ляснуў па іх кулаком. Тыя лёгка расчыніліся. Казік уваліўся ў кабінку і аслупянеў.

Пакой машыніста быў ахутаны прывідным святлом. Таямніча паблісквалі рознакаляровыя лямпачкі прыбораў. Наперадзе, у промнях ліхтароў, зеўраў глыбінёй тунэль, зацягваючы ў сябе поезд. Але не гэта ўразіла

Казіка найбольш. Яго вочы былі прыкутыя да штукі, якая звісала з крэсла.

Гэта быў шырокі пляскаты скураны хвост.

— Сюды нельга! — пачуўся абураны голас. — Куды пхнешся, паночку шаноўны?

Крэсла рэзка крутанулася. Машыніст апынуўся твар у твар з хлопчыкам. Ён быў такі мажны, што ледзьве змяшчаўся на сядзенні. Блакітная кашуля ўніформы туга нацягнулася на ягоным пукатым жываце. Фуражка з пазалочанай кукардай у форме дубовага лістка была зухавата ссунутая на патыліцу. Незнаёмец трымаў у руках пакамечаны пакецік чыпсаў з назвай «Хрубрыкс-бубрыкс» і аблізваў пальцы. Ва ўсім гэтым не было б нічога незвычайнага, каб толькі не адна акалічнасць.

Гэта быў зусім не чалавек.

Калючыя вусікі, цёмна-рудая шэрсць, шчарбатая ўсмешка з двума вялікімі зубамі ды маленькія чорныя вочкі. А да ўсяго — пляскаты скураны хвост, які звісаў з крэсла. Казік быў гатовы прысягнуць, што перад ім сапраўдны бабёр.

— Авохці мне!

Як толькі незвычайны машыніст разгледзеў Казіка, ягоная сківіца адвісла ледзь не да падлогі.

— Аёй! Чалавек! Сапраўдны чалавек, п’яўка мне на хвост!

Бабёр у жаху закрыў вочы лапамі, нібы малое дзіцё, якое гуляецца ў хованкі. Чыпсы, падобныя да драўляных стружак, высыпаліся з пакеціка і разляцеліся па кабіне.

— Не м-м-можа быць! — прамармытаў бабёр запінаючыся.

«І праўда — не можа», — падумаў Казік. Хіба бабры размаўляюць? Ды яшчэ і кіруюць цягнікамі ў метро? Мабыць, ён гэта прысніў. Хлопчык балюча ўшчыкнуў сябе за шчаку, але сон нікуды не знікаў.

— Гм... Кхм... Слухайце, як вас там... Малады чалавек! Зараз жа сыдзіце з цягніка! — запатрабаваў бабёр дрыготкім голасам, усё яшчэ хаваючы твар у сваіх лапах.

«Клас», — падумаў Казік. Дык што яму цяпер — скочыць на ўсёй хуткасці з вагона?

— Э-э-э... Спадар машыніст, мы едзем у тунэлі. Я разаб'юся, калі выйду.

Бабёр застагнаў у роспачы.

— Ы-ы-ых... Але табе ніяк нельга тут быць! Вой-вой, аёюшкі... Чуюць мае вусікі, дрэнна ўсё гэта скончыцца, вельмі, вельмі дрэнна...

Дзіўная рэч. Нейкую хвіліну таму Казік хваляваўся, што машыніст будзе сварыцца на яго. Але, слухаючы бабра, можна было падумаць, што той сам зрабіў штосьці нядобрае.

— Можа, я проста злезу на наступнай станцыі? — асцярожна прапанаваў Казік.

Бабёр толькі глыбей схаваў твар у лапы і горка застагнаў.

— Не выйдзе... Наступная станцыя... Табе туды нельга.

— А куды мы ўвогуле едзем?

— Табе няможна гэтага ведаць.

— Чаму?

— Ды што ты прыстаў як слявяда. Чаму-чаму... Таму. Нельга, і ўсё! Бо ты чалавек.

— І што?

— А тое, што людзям не дазваляецца ведаць пра Схаваны Горад.

Бабёр прыкусіў свой язык, але было позна. Ён яўна сказаў лішняе. Казік навастрыў вушы.

— Які-які горад? Схаваны? Ад каго?

Але бабёр як вады ў рот набраў. Поезд ляцеў далей, толькі іскры сыпаліся за вокнамі ў цемрадзі. Раптам машыніст выпрастаўся. Яго вочы рашуча бліснулі. Завішчэлі тармазы. Застагналі колы. Цягнік са скрыгатам спыніўся.

Калі грукат суцішыўся, на іх навалілася цішыня. Цемра, нібы вялікая чорная падушка, сціснула вагон з усіх бакоў.

Бабёр зірнуў Казіку ў твар.

— Выбачай, братка, але табе трэба адсюль вымятацца.

Казік спужана міргнуў.

— Ды не хвалюйся ты так. Мы ж зусім неглыбока заехалі. Твой горад вунь тамака, назад па тунэлі. Хіба пару-тройку якіх кіламетраў адсюль. Адзін паварот пройдзеш, другі, а там — тупай-тупай напрасткі, і будзе табе Мінск.

Машыніст адчыніў дзверы кабіны, саскочыў уніз і працягнуў лапу, каб памагчы Казіку злезці.

— Ну прагуляешся гадзінку-другую, што тут такога. Але ж трымайся на ўсякі выпадак бліжэй да сцяны. Раптам будзе іншы поезд ехаць, то каб цябе не расціснула.

Казік з заміраннем сэрца зірнуў у цёмную пашчу тунэля. Дзе-нідзе ён быў асветлены слабенькімі ліхтарамі. Ланцуг агеньчыкаў цягнуўся ў бясконцасць і знікаў у змрочнай глыбіні.

Бабёр разгублена паскроб патыліцу і ўздыхнуў, адводзячы вочы:

— Слухай, дзядзька, я мо і ўзяў бы цябе з сабой. Але ж ты чалавек. А туды, куды я еду, людзям нават нагой ступаць забаронена.

— У Схаваны Горад?

Бабёр ажно здрыгануўся, калі Казік прамовіў гэтую назву.

— Цішэй ты. Чаго раскрычаўся? Ну так, у Схаваны Горад. Але табе туды шляху няма. Не крыўдуй. Дый увогуле, забудзься пра ўсё гэта, я табе раю. Як вернешся ў свой чалавечы горад, то ўяві сабе, што ты ўсё прысніў. Згода?

Павісла няёмкая паўза.

— Вось, трымай. У дарозе спатрэбіцца.

Бабёр сунуў Казіку ржавы стары ліхтар. Хлопчык пакруціў яго ў руках.

— У мяне няма запалак, — разгублена сказаў Казік. — Ці ён электрычны?

Бабёр пляснуў сябе па лбе лапай.

— Ды што ж гэта я, стары дурань. Скуль табе ведаць? От глядзі — проста падзьмі на яго.

Казік паднёс ліхтар да самых вачэй. Унутры нешта ціха заскрэблася. Дзівакавата сябе адчуваючы, хлопчык набраў паветра і асцярожна дыхнуў на мутнае шкло.

— Не бойся, — падбадзёрыў машыніст. — Дзьмі смялей, каб яны прачнуліся.

Казік дзьмухнуў яшчэ раз. Спачатку нічога не адбылося. Шамаценне ў ліхтары сціхла. Але потым яно ўсчалося з новай сілай. Можна было падумаць, што ўсярэдзіне ліхтара гарэзнічае чародка птушак. І раптам праз запыленае шкельца прабіўся слабы прамень святла. Казік зноў падзьмуў, гэтым разам мацней, нібыта спрабаваў ажывіць вуголле старога вогнішча. І вось

дзіва — у ліхтары з'явіўся жоўты язычок полымя! Ён складаўся з безлічы маленечкіх зорачак, якія танцавалі і свяціліся. Цемра адразу адступіла на некалькі крокаў. Казік глядзеў на ліхтар як заварожаны.

Бабёр памахаў Казіку на развітанне лапай.

— Роўнай табе дарожкі. Ты ідзі-ідзі. Я крыху папільную, а потым паеду сабе далей.

Казік крыху ўздыхнуў і павольна рушыў уздоўж рэек па шпалах назад, у бок горада. Ён тупаў, ахутаны зыбкім воблачкам святла з ліхтара, і думаў. Што ні кажы, а гэта была незвычайная прыгода, хоць і вельмі кароткая. Шкада толькі, што нікому пра яе не раскажаш — бо хто паверыць? Ды хлопчык і сам не даў бы сабе веры, каб толькі ў ягонай руцэ не боўтаўся ліхтар з чароўным жывым агеньчыкам.

Ён азірнуўся. Бабёр усё назіраў за ім здалёк — відаць, хацеў пераканацца, што Казік сапраўды сыдзе, а не заскочыць назад у цягнік.

— Ба-бах!

Ногі Казіка заблыталіся ў нейкай стужцы, і ён паляцеў носам уніз. Ліхтар з ляскатам зваліўся на рэйкі — добра яшчэ, што не пабіўся.

— Ах, каб цябе...

Хлопчык узняўся, абтрос пыл і разгледзеў тое, што трапіла яму пад ногі. Гэта быў скрутак тканіны срэбнага колеру.

Што гэта?

Матэрыял быў халодны навобмацак. Дзіўна... І тут сэрца Казіка паледзянела. Ён трымаў у руках змяіную скуру!

Раптам ззаду пачуліся хуткія крокі. З цемры, цяжка дыхаючы, выплыў бабёр.

— Уфф... Я зусім забыўся табе сказаць. Як вернешся ў Мінск, то выпусці іх на волю.

— Каго?

— Ды светлякоў!

І паказаў лапай на ліхтар.

— Там унутры светлякі. Калі не выпусціш, яны загінуць з голаду. І так ужо ледзь свецяцца. А гэта яшчэ што такое?

Прамень ліхтара ўпаў на скрутак змяінай скуры пад нагамі Казіка. Яна злавесна бліснула. Бабрыныя вочы акругліліся ад жаху.

— Шыбуй за мной! — выдыхнуў ён у вуха Казіку. — Хутчэй назад, у поезд! Ходу, ходу!

Бабёр выхапіў ліхтар з рук Казіка і загарнуў у сваю куртку, каб схаваць святло. Яны беглі ў поўнай цемры, навобмацак. Казік штосекунды чакаў, што зваліцца ды разаб'е сабе лоб.

Нейкім цудам яны дабраліся да поезда, не скруціўшы галоў. Бабёр падсадзіў хлопца ў кабіну, шчыльна зачыніў дзверы і зашчоўкнуў замок.

— Спра... Спра... Справы дрэнь, — задыхана прастагнаў ён. — Змяіны патруль. Калі тут валяецца скура, значыцца, яны недзе побач, пільнуюць тунэль.

— Што?

— Табе нельга ісці назад. Воечкі-аёечкі. Што ж мне цяпер рабіць?

Бабёр выцер гальштукам пот з ілба.

— Уф... Як цябе клічуць, хлопча?

— Казік.

— Добра, Казік. Слухай сюды.

Бабёр прымружыўся, пільна ўглядаючыся хлопчыку ў вочы. Здавалася, ён спрабаваў зразумець, ці можна

давяраць гэтаму маленькаму чалавеку, які так раптоўна зваліўся яму на галаву.

— Скажы, Казік... Ці ты ўмееш захоўваць таямніцы?

І хоць рукі хлопчыка трэсліся, а ягоныя каленкі, здавалася, ператварыліся ад сполаху ў жэле, яго твар міжхоцькі расплыўся ва ўсмешцы. Эге! Здаецца, сапраўдныя прыгоды яшчэ толькі-толькі пачыналіся.

Бабёр заўважыў гэта ды насупіў бровы:

— Гэта табе не жарцікі жартаваць. Змяіны патруль ахоўвае ўваход у Схаваны Горад. Калі нас схопяць, то мяне ўпякуць у турму. А што з табой зробяць, я нават і ўяўляць не хачу. Скажу шчыра — уляпаліся мы з табою ў гісторыю, як мухі ў саладуху. Па самыя вушы. У Мінск табе зараз вяртацца нельга, бо змяюкі цябе зловяць у тунэлі. Значыцца, паедзеш са мной.

— У Схаваны Горад?

— Так, у Схаваны Горад, трасца мне ў бок.

— Ура!

— Якое ўра? Не на гулі едзем. Проста іншага выбару няма. Але ты павінен прысягнуць, што будзеш трымаць рот на замку. Каб ні слова — нікому — пра тое, што пабачыш. Абяцаеш?

— Абяцаю.

Бабёр змерыў хлопчыка доўгім, поўным сумневу позіркам. Потым адчайна махнуў лапай і запусціў рухавік:

— Няма часу думаць. Паехалі!

Казік стаяў за крэслам машыніста і пазіраў наперад з-за бабрынага пляча. Цёмны глыбокі тунэль ляцеў ім насустрач. І тут хлопчыку ўспомніўся Рэксік. Дык вось чаму стары трусік так хацеў трапіць на гэты поезд! Што б ні хаваў у сабе той Схаваны Горад, у ім будзе яўна цікавей, чым у цеснай кардоннай скрынцы.

## Раздзел чацвёрты

# КІПЦЮРОВАЯ БРАМА

Цягнік грукатаў, падскокваў, нахіляўся на паваротах і ўсё глыбей зацягваў Казіка ў падземныя нетры.

— Зваліўся ты мне як звон на галаву, — прабуркатаў бабёр цераз плячо. — Але што ўжо тут паробіш. Калі так — то давай знаёміцца.

Ён прыўзняў фуражку ды адрэкамендаваўся:

— Дабрагрыз Бабрыцкі, машыніст экспрэса Схаванага Горада. Можаш клікаць мяне проста Добрусь.

Казік паціснуў шурпатую бабрыную лапу.

— Толькі давай, братка, дамовімся: з гэтага моманту ты робіш усё дакладна так, як я скажу. Будзеш паслухмяны — і я вярну цябе назад у Мінск жывым ды здаровенькім. А цяперака не замінай, мне трэба сканцэнтравацца на дарозе.

Бабёр павярнуўся да прыбораў, зноў захрусцеў «Хрубрыкс-бубрыксам».

— Частуйся, — працягнуў ён пакунак Казіку.

Казік закінуў чыпсіну ў рот.

— Цьху... Што гэта?

«Хрубрыкс-бубрыкс» аказаўся сапраўднай драўлянай стружкай, пасыпанай соллю. Для бабра — сама тое, але Казіку такі пачастунак быў не па зубах.

Аднекуль збоку праз грукат цягніка пачуўся шоргат, як быццам нехта скроб па шкле кіпцюрыкамі. Казік павярнуў галаву і ўбачыў за акном дзіўную маленькую істоту. Яна ляцела — менавіта ляцела — побач з цягніком, то трохі абганяючы яго, то зноў адстаючы, і ўвесь час хутка-хутка матляла скуранымі крылцамі. Калі б не вялізная сумка з безліччу кішэняў, якая боўталася на шыі істоты, дык Казік быў бы гатовы залажыцца на што заўгодна, што перад ім быў кажан.

Істота відавочна стамілася ляцець навыперадкі з цягніком. Высалапіўшы язык, яна раз-пораз пазірала ў бок кабіны, умольна складала крылцы ды рабіла нейкія знакі сваімі лапкамі. Казік не разумеў, што яна спрабуе сказаць, таму толькі паціснуў плячыма ў адказ.

— Ты з кім там пераміргваешся? — спытаўся Добрусь.

— Ды вунь нехта ляціць побач і кіпцюрамі па шкле скрабе.

— Авохці мне! — выкрыкнуў Добрусь, ірвануўся да акна ды расчыніў яго. — Залятай хутчэй!

Дзіўны кажан уваліўся ў кабіну, на імгненне завіс у паветры, боўтаючы крылцамі, ды знясілена грымнуўся на падлогу.

— Паміраю! — віскнуў ён. — Змучылі! Я вам што, дыван-самалёт? За вамі не ўгонішся!

Добрусь вінавата пачухаў патыліцу:

— Ты б пагрукаўся ці што...

— Ды я за поездам ужо паўгадзіны лячу — і па шкле скроб, і сумкай у сценку вагона грукаў, а табе хоць бы

што! — не супыняўся кажан. — Звольнюся я з гэтай працы, заўтра ж звольнюся. Абрыдла бегаць за вамі ўсімі.

— Ды супакойся ты ўжо. Можа, малачка жадаеш? — прымірэнча прапанаваў Добрусь.

— Халоднае? — адразу зацікавіўся кажан.

— Вядома!

Добрусь адчыніў дзверцы маленькай лядоўні, прыладжанай у кабіне за ягоным крэслам, і дастаў адтуль бутэлечку малака. Незнаёмец схапіў яе сваімі крылцамі і, прагна булькаючы, пачаў піць доўгімі глыткамі. Раптам яго вочы натрапілі на Казіка.

— Буль... Бгуль... Кхе! Пфе! Пхэ!

Кажан папярхнуўся, абдаўшы кабіну фантанам белых пырскаў, падскочыў у паветра і кінуўся ў акно:

— Ратуйце!

Плясь!

Ён з размаху ляснуўся ў зачыненую шыбу, распластаўся крыламі па шкле і з’ехаў на падлогу непрытомны.

— Гэй, ты жывы?

Добрусь схіліўся над кажаном, прыўзняў яго крыло і адпусціў — тое ўпала на падлогу, нібы анучка.

— Зусім вырубіўся, небарака.

Бабёр крапнуў кажану малака на нос. Той зварухнуўся, аблізнуўся і млява прамовіў:

— Добрусь, які дзіўны сон. Мне здалося, што я бачыў чалавека.

Бабёр уздыхнуў:

— Не, братка, баюся, гэта не сон.

Кажан сеў і ўперыўся ў Казіка круглымі вачыма.

— Значыцца, гэта і праўда чалавек? Адкуль? Як?

— Ды вось прыбіўся да мяне. Завязу яго пакуль што ў Схаваны Горад. Там прыхаваю, а пасля абеду закіну зваротным рэйсам у Мінск. Ты толькі нікому не кажы.

Кажан дакорліва паглядзеў на бабра:

— Добрусь, ты ж мяне не першы год ведаеш. Калі гэта я здраджваў сябрам?

Ён акуратна працягнуў Казіку крыло для поціску.

— Мяне завуць Пырхлік. Я кажан, працую паштальёнам. Дастаўляю лісты ды газеты па падпісцы. Во яшчэ колькі сёння трэба разнесці.

— Слухай, — ажывіўся Добрусь, — а «Ранішні лісток» свежы маеш?

— А то не! Я таму і ляцеў за вамі — хацеў аддаць табе газету, а заадно і даехаць да горада з ветрыкам. Усё ж лепей, чым ляцець праз гэты чорны тунэль.

Пырхлік выцягнуў з сумкі газету, складзеную з вялікіх лістоў лопуху, сшытых разам белай павуцінкай. Добрусь разгарнуў «Ранішні лісток» так, каб усім траім было ёмка чытаць.

Амаль на палову ўсёй першай старонкі стаяў загаловак: «Пажар у мурашніку!» Пад ім быў вялікі фотаздымак вусатага жука ў бліскучай касцы. У артыкуле расказвалася пра пажар у мурашніку на праспекце Хваёвых Пупышак:

«Па сігнале трывогі на месца трагедыі вылецела пятнаццаць тысяч жукоў-пажарных. На шчасце, ніхто не пацярпеў, бо мурашнік быў пусты — усе яго насельнікі пайшлі ў кіно на прэм'еру новага фільма "Вяртанне Супермураша-2"».

Далей ішло інтэрв'ю з галоўным жуком-пажарным, які доўга і крыху занудна расказваў пра тое, як небяспечна гуляцца з агнём.

— Вось дык справы! — пахітаў галавой Добрусь. — Што дзівіцца, іх жа там безліч. Няйначай нехта з мурашоў забыўся выключыць прас ці нешта такое.

На другой старонцы газеты была крымінальная хроніка.

«Жучыная мафія вяртаецца, — прачытаў Казік уголас. — Нахабнае злачынства адбылося ўчора на Чабаровым праспекце — невядомыя зламыснікі ўгналі спартыўную ракавіну».

І праўда — на фота была ракавіна з вялікімі фарамі, пафарбаваная ў карамельна-чырвоны колер — акурат гоначная машына.

«Пацярпелы слімак папрасіў не называць яго імя і прозвішча. “Я прыпаркаваўся ды адышоў на хвілінку, каб заправіцца свежай слiззю, — распавёў ён карэспандэнту «Ранішняга лістка». — Але не паспеў прапаўзці і паловы сантыметра, як маёй ракавіны ўжо і след прастыў”. Па звестках нашага карэспандэнта, паліцыя адшукала на месцы здарэння крошкі бульбяных чыпсаў і сляды жучыных лап. Мяркуючы па ўсім, пасля доўгага перапынку Паласатая брыгада зноў з’явілася ў горадзе. Арганізаваная злачыннасць распраўляе свае чорна-жоўтыя крылы. Куды глядзяць праваабаронцы?»

Казік узняў вочы ад газеты:

— А што такое Паласатая брыгада?

Добрусь гідліва фыркнуў:

— Банда каларадскіх жукоў. Бандзюкі яшчэ тыя. Калі нешта дзесьці скралі, разламалі ці яшчэ як напаскудзілі, то так і ведай — іхніх лап справа. Нешта даўно нічога не было пра іх чуваць. Але ж во, бач ты, зноў з’явіліся — не запыліліся.

Казік ажно крэкнуў са смеху. Яму так і ўявілася карціна: паласатыя жукі-зладзеі едуць на скрадзенай слімаковай ракавінцы, радасна рагочуць і хрумкаюць чыпсамі з бульбянога шалупіння.

За крымінальнай хронікай ішла спартыўная старонка. Там стаяў рэпартаж з невядомай хлопчыку гульні пад назвай зверабол. На здымку натоўп розных жывёл у спартыўнай форме перакідваўся калматым жоўтым мячыкам.

— А ў чым сэнс гэтага зверабола?

— Трэба выбіць як мага больш гульцоў з іншай каманды.

Добрусь памацаў пад сядзеннем і выграб адтуль такі самы мячык, як на фота:

— Лаві!

Бабёр шпульнуў у Казіка мячык, які ўчапіўся ў вопратку так, што хлопчык ледзь ягоададраў. Аказалася, што ён зроблены з шарыкаў дзядоўніку — расліны, якая чапляе іх на кожнага, хто пройдзе побач.

— Да каго прыліпае мяч, той выбывае з гульні. І так пакуль у нейкай камандзе не скончацца гульцы. Усё вельмі проста.

Добрусь гартаў газету далей. У рубрыцы «Навіны шоу-бізнесу» палову старонкі займаў здымак маленькай зялёнай жабкі ў бліскучай срэбнай вопратцы. Прымружыўшы свае лупатыя вочы, яна саладжава спявала нешта ў вялізны мікрафон.

— Канцэрт стагоддзя! Чарговы конкурс спеваў «Багнабачанне» праходзіць сёння ў Альманскіх балотах над Прыпяццю. На фота: суперзорка Квак Дрыгвянік скарае сэрцы слухачоў.

— Цьху, — плюнуў Добрусь. — Абы-што.

Тунэль наперадзе пасвятлеў. Бабёр схамянуўся, адклаў газету і ўзяўся за рычаг кіравання:

— А цяпер — увага. Будзьма напагатове.

Рух запавольваўся. Хлопчык прыціснуў нос да шкла. Змрок, які ахутваў поезд, патроху змяняў свой колер з чорнага на цёмна-зялёны. Яны выехалі з тунэля. Наўкола густой хмарай вісела лісце.

— Якое вялізнае дрэва!

Поезд, нібы па эстакадзе, каціўся па шырачэзнай галіне старога клёна. Ніколі ў сваім жыцці Казік не бачыў такой аграменнай расліны. Рэйкі вялі па галіне, нібы па мосце, у вялікае дупло, якое зеўрала наперадзе.

— Гэта Кіпцюровая брама, — прашаптаў Добрусь. — Вароты ў Схаваны Горад.

Поезд сунуўся наперад зусім павольна. Цвёрдыя галіны клёна скрэблі па яго металічнай абалонцы. Казік зморшчыўся і заціснуў вушы далонямі. Скрыгат стаяў такі, што можна было аглухнуць. Здавалася, што дрэва чаплялася за цягнік доўгімі кіпцюрамі, беручы яго ў свой палон.

Поезд заехаў у дупло, гучна чмыхнуў ды спыніўся на вузкай платформе. Галіны-шчупальцы зноў заварушыліся і шчыльна зачынілі ўваход. У Казіка непрыемна ёкнула сэрца. А раптам гэта была пастка?

На платформе загарэліся ліхтары. Добрусь нервова агледзеў кабіну.

— Так-так-так... Дзе б нам цябе схаваць? Вось што — залазь за крэсла. От, малайчына. Тутака яны цябе не пабачаць.

Казік паслухмяна скурчыўся за сядзеннем машыніста. Ён так і не паспеў запытаць, кім былі гэтыя таямнічыя «яны», ад якіх трэба было хавацца. Пырхлік

сеў хлопчыку на спіну, расправіў крылы, каб захіліць яго, і заціх.

Добрусь заглушыў рухавік ды адчыніў акно. Неўзабаве сталі чуваць нечыя крокі.

— Хо-хо, здароўкі, Борк! — нібы з гарматы, гукнуў Добрусь праз усю платформу. — Даўнавата не бачыліся, старэча. Як маешся?

— Нар-р-рмалёк, — рохкнуў нехта ў адказ. — Што новага ў чалавечым хр-хр-горадзе?

— Ды ўсё як звычайна, — адмахнуўся Добрусь. — Людзі таўкуцца як камары, паўсюль смярдзіць бензінам, машыны гудуць так, што аглухнуць можна. Ат, няма ахвоты нават расказваць.

— Добра, добра. Хр-хр. Як сам? Усё ў парадку? Недазволенага не вязеш?

— Што ты, Борк, — абурыўся Добрусь. — Хіба ты мяне не ведаеш?

— Не крыўдуй, не крыўдуй. Хр-хр. Мушу спытацца, а што р-р-рабіць. Такая праца. Хыр-хыр.

Казік крыху асмялеў, прыўзняў галаву ды краёчкам вока зірнуў у бакавое люстэрка. У ім адбіваўся каржакаваты дзік у форме паліцыянта. Ён шчоўкаў жоўтымі крывымі іклямі і лянiва пачэсваў сабе бок.

— Добра, добра, — прабурчэў Борк і махнуў капытом. — Р-роўнай табе дар-р-рожкі.

Добрусь адсалютаваў дзіку-паліцыянту і ўжо хацеў рушыць далей. Але раптам у кабіну ўпоўз іншы, ціхі, але злавесны голас:

— Не спяш-ш-ш-айся.

Добрусь застыў. Мурашкі пабеглі ў Казіка па скуры.

— Ты неш-ш-шта хаваеш-ш-ш ад мяне, маш-шыніс-ст.

Бабёр ад хвалявання каўтнуў сліну і закашляўся.

— Кхе-хе... Паночку афіцэр, як можна? Ды я нідзе нічога...

— Ш-ш-што ў цябе там, за с-с-спінай?

Казікава сэрца затахкала, нібы матацыклетны рухавік. Ён сцяўся ў камячок ад страху. Калі кабіну абшукаюць, яму не схавацца...

Пачуўся ціхі шоргат. Нешта праслізнула ў кабіну. Праз імгненне Казік у жаху пабачыў, як зверху, проста перад самым яго носам, звесіўся змяіны хвост, пакрыты шэра-зялёнай луской, і пачаў звівацца, абмацваючы ўсё навокал.

Казік у нямым жаху зірнуў на Пырхліка. Той паднёс палец да губ, даючы сігнал, каб хлопчык не рабіў шуму. А потым кажан зрабіў нешта зусім нечаканае. Ён схапіўся за змяіны хвост сваім крыламі! Той тарганууся і пацягнуў кажана наверх. У апошні момант Пырхлік паспеў падміргнуць Казіку, а потым знік з яго вачэй. З платформы данеслася злоснае шыпенне:

— Х-х-хто гэта?

— Аё-ёй, паночку афіцэр, не сціскайце мяне так моцна...

— Ус-с-сё яс-с-сна. Безбілетнік. Вось каго ты вёз, бабёр.

— Я ўсё растлумачу!

— Маўч-ч-чаць. Безбілетніку штраф — два зялёныя жалуды. А ты, маш-шыніст, калі яшчэ раз напададзеш-ш-ш-ся мне са сваімі хітрыкамі, то будзеш вадзіць не поезд, а вазок з гноем на бульбяных палетках. А цяпер — прэч адсюль.

Вецце вялізнага клёна, якое аплятала выезд з платформы, пачало рухацца. Лісце з шоргатам зварочвалася, галіны рассоўваліся. Шлях наперад быў вольны.

Казік не наважваўся зварухнуцца, пакуль цягнік не рушыў з месца. Лапы Добруся трэсліся. Форменная кашуля набрыняла потам. Фуражка звалілася на падлогу.

— Уфф, я ўжо думаў, нам кірдык.

Казік асцярожна вынырнуў з-за сядзення:

— А дзе Пырхлік?

— Высадзілі з поезда.

— Вой-вой, спадзяюся, з ім усё будзе ў парадку. Ён жа мяне ўратаваў! А хто гэта быў такі страшны, з хвастом?

Добрусь сцепануў плячыма, нібыта на яго павеяла ледзяным ветрам.

— Змяіны патруль. Сакрэтная паліцыя. Яны сочаць, каб двухногія... Ну, гэта знача людзі — накшталт цябе, — каб яны не трапілі ў Схаваны Горад.

Бабёр тузануў шнурок гудка.

— Ту-ту-у-у! — завыў цягнік.

Ён узяў разгон і праз імгненне праваліўся ў бяздонны акіян сляпучага святла.

— Ратуйце! Падаем!

Хлопчык інстынктыўна зажмурыўся. Здавалася, яны ляцелі ў паветры. Яшчэ імгненне — і вагоны зваляцца ў бездань ды разаб'юцца на дробныя кавалкі!

Аднак секунда бегла за секундай, а нічога страшнага не адбывалася. Казік набраўся смеласці ды расплюшчыў вочы. Звыкшыся са святлом, хлопчык пабачыў, што поезд не падаў, а з грукатам ляцеў высокім мостам над шырокай, залітай святлом далінай.

Навокал расхінаўся маляўнічы краявід. Далёка ўнізе мільгалі палеткі, падобныя да коўдры, сшытай з рознакаляровых кавалачкаў тканіны. А паміж імі, нібы цацачныя кубікі, былі раскіданыя невялікія хаткі. На даля-

глядзе паблісквала люстэркам рака, якая вілася да самага гарызонту. І паўсюль, куды толькі сягала вока, узвышаліся магутныя дрэвы. Гэта былі сапраўдныя волаты. Яны ўздымаліся вышэй за мост, цягнуліся ўгару, а іх вершаліны губляліся ў небе.

Адкуль гэта ўсё тут? Яны былі глыбока пад зямлёй, у пячорах ды падзямеллях заўжды павінна быць цёмна — але навакольная прастора купалася ў яркім святле! Яно струменілася з неба, ахутанага лёгкай белай смугой, праз якую прасвечвала сонца. Дзіўна…

Добрусь выцер узмакрэлы лоб аркушам «Ранішняга лістка» з рэкламнай аб'явай. Гэта быў яркі малюнак бургера, такога сакавітага, што ў Казіка ажно слінкі пацяклі. Толькі цяпер хлопчык адчуў, што такі добра прагаладаўся. Страўнік Добруся азваўся галодным буркатаннем.

— Гэта абвестка рэстарацыі «Пан Картаплян». Там гатуюць найлепшыя буракбургеры ў свеце. Як будзем на месцы, то абавязкова забяжым туды. У цябе ўвогуле якія былі планы на Схаваны Горад? Што хацеў пабачыць? Ану прызнавайся!

Казік сумеўся:

— Ды ніякіх. Я ўвогуле нічога пра яго раней не чуў.

Бабёр дапытліва прыжмурыў вочы.

— Што, зусім нічагусенькі не ведаеш пра Схаваны Горад? Але ж з нейкай халеры ты сюды папёрся, га?

Казік толькі развёў рукамі ў адказ. Добрусь строга паглядзеў на яго:

— Ой, толькі не брашы мне, хлопча. Не можа быць, каб ты апынуўся ў гэтым поездзе проста так, ад няма чаго рабіць. Што табе тут спатрэбілася?

— Ну… Як бы гэта сказаць… Я гнаўся за сваім хатнім трусікам.

Добрусь агаломшана перапытаў:

— Якім-якім? Хатнім?

— Угу. Ён збег ад мяне.

— Збег? Чаму?

Казік на секунду прызадумаўся. Гісторыя з Рэксікам выглядала не надта прыгожа з яго боку. Як ні круці, а ён нядобра абышоўся са сваім хатнім гадаванцам. Саромеўся яго, прымусіў удзельнічаць у дурным маскарадзе, а потым яшчэ і згубіў. Наўрад ці ўсё гэта будзе даспадобы Добрусю. Усё ж бабёр таксама належаў да жывёльнага свету, як і Рэксік. Раптам раззлуецца ды выкіне Казіка на паўдарозе?

— Э-э-э... Кхм... Як бы сказаць... Я забыўся зачыніць ягоную скрынку. Вось ён і збег.

Гэта была не ўся праўда, а толькі яе кавалачак. Але і гэтай паўпраўды хапіла, каб Добрусь схапіўся за галаву.

— Слухай сюды, хлопча. І слухай мяне ўважліва. Вось табе два правілы. Трымайся іх, каб не трапіць у бяду ў Схаваным Горадзе.

— Давай.

— Па-першае. Ніколі нікому тут не давай зразумець, што ты чалавек. Праход у Схаваны Горад для людзей забаронены. Зарубіў на носе?

— Ага. А другое?

— Па-другое — нават калі хтосьці прызнае цябе за чалавека, то ніколі, ні ў якім разе не прызнавайся, што ты трымаў жывёлу ў скрынцы, клетцы ці проста ў няволі. Гэта звярам Схаванага Горада вельмі не спадабаецца. Наматаў на вус?

Казік кіўнуў, а сам цішком узрадаваўся, што не расказаў Добрусю гісторыю з Рэксікам цалкам.

— Значыцца, у Схаваным Горадзе жывуць адны звяры? — спытаўся хлопчык, каб хутчэй саскочыць з гэтай далікатнай тэмы.

— Не толькі. Яшчэ і рыбы, птушкі, жучкі-павучкі розныя. Ну, карацей, усе тыя, каму не хапіла месца на паверхні Зямлі.

— Як гэта — не хапіла? — не зразумеў Казік. — Зямля ж такая вялікая!

Добрусь сумна ўсміхнуўся:

— Э, хлопча, гэта табе толькі так здаецца. Ты чалавек. Для вас, людзей, паўсюль месца ёсць. Ды вось толькі вы не любіце гэтым месцам дзяліцца. Ты ж у Мінску жывеш?

— Так, — адказаў Казік.

— А ці ёсць у вас у Мінску ласі?

Казік разгублена міргнуў:

— Э-э-э... Адкуль жа ў горадзе ласі?

— А ваўкі?

— Не-а. Хіба што ў заапарку.

— А ў вашай рэчцы — як яе там...

— Свіслач.

— Ага, у Свіслачы — ці шмат там рыбы? — працягваў свой допыт Добрусь.

— Можа, і водзіцца, толькі я яе не заўважаў, — развёў рукамі Казік. — Вада каламутная вельмі.

— Вось бачыш. Хто ж захоча жыць у такой вадзе? Людзі пабудавалі гэты горад для сябе. А нам, звярам, куды падзецца? Лясы ссеклі. Рэкі забрудзілі. Нават паветрам дыхаць брыдка — вунь колькі машын навокал. Цяжка жыць побач з чалавекам! Вось таму звяры, якім не хапіла месца пад сонцам, і вырашылі пабудаваць падземны горад.

Добрусь урачыста падняў палец угару і дадаў таямнічым шэптам:

— Схаваны Горад!

— А чаму схаваны?

— Ну, каб ніхто не адшукаў.

Казік здзіўлена агледзеў краявід, што прасціраўся за вокнамі цягніка.

— Дык што — усё гэта знаходзіцца пад зямлёй, пад самым Мінскам?

Добрусь з гонарам кіўнуў:

— Менавіта так.

— Але ж гэтае месца такое агромністае — цэлая краіна! Чаму ніхто наверсе ніколі не чуў пра звярыны горад?

— Бо мы вельмі добра сцеражом яго ад людзей. Дакладней... э-э-э... сцераглі. Да сённяшняга дня.

Добрусь збянтэжана пачухаў патыліцу. Яны змоўклі. Казік адчуваў на сабе дапытлівы бабрыны позірк.

— Я нікому не раскажу пра Схаваны Горад, — запэўніў Казік. — Абяцаю! Ды і хто мне паверыць, каб я і расказаў? Засмяюць толькі. Падземны горад глыбока пад Мінскам, поўны звяроў? Такога не бывае.

Добрусь строга паглядзеў Казіку ў вочы.

— Наматай на вус, хлопча. Выдаць сакрэт Схаванага Горада людзям — гэта цяжкае злачынства. За гэта мяне па галоўцы не пагладзяць. А пусціць чалавека ў Схаваны Горад — гэта ўвогуле здрада. Разумееш? Ты павінен быць вельмі, вельмі асцярожны. Інакш мы абодва можам апынуцца ў вялікай бядзе.

— Добра-добра. Пастараюся.

— Паглядзім-паглядзім, — прамармытаў Добрусь і з сумневам прыкусіў свой кіпцюр.